

# КРЫВАВАЯ ПЯТНІЦА ПАРЫЖА

## Якім будзе адказ сусветнай супольнасці?

**Сёлетняя пятніца 13 лістапада назаўжды застанецца не толькі ў найноўшай гісторыі Францыі, а і ўсяго свету як крывавая, страшная старонка. У гэты дзень увечары ў Парыжы адбыліся сем тэрактаў, ахвярамі якіх сталі амаль паўтысячы чалавек — 132 загінулі, 352 паранены (многія знаходзяцца ў крытычным стане). Адказнасць за бойню ўзяла на сябе «Ісламская дзяржава».**

**Пытанне супрацьстаяння тэрарызму было ў цэнтры ўвагі ўдзельнікаў дзясятага саміту G20 (Вялікай дваццаткі — кіраўнікоў Аўстраліі, Аргенціны, Бразіліі, Вялікабрытаніі, Германіі, Індыі, Інданезіі, Італіі, Канады, Кітая, Мексікі, Паўднёвай Карэі, Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі, Расіі, Саудаўскай Аравіі, ЗША, Турцыі, Францыі, Японіі і Еўрапейскага саюза), які прайшоў 15-16 лістапада ў турэцкай Анталі. Зразумела, што з прычыны тэрактаў Прэзідэнт Францыі Франсуа Аланд не змог прысутнічаць на саміце, краіну прадстаўлялі кіраўнік МУС Ларан Фабіус і міністр фінансаў Мішэль Сапен. Крывавая пятніца ў Парыжы прымусіла сусветных лідараў усур'ёз задумацца пра адэкватны адказ на выклікі тэрарыстаў.**



**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванне Прэзідэнту Францыі Франсуа Аланду ў сувязі з вялікай колькасцю ахвяр у выніку серыі тэрактаў у Парыжы, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. «З вялікім болем успрынялі ў Беларусі вестку аб шматлікіх чалавечых ахвярах у выніку тэрарыстычных актаў. Ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказваю самыя шчырыя спачуванні і словы падтрымкі родным і блізкім загінулых і пацярпелых, а таксама ўсяму французскаму народу», — адзначаецца ў спачуванні.**

### НЕ СХАВАЦЦА

За апошнія дзесяць гадоў ахвярамі тэрарыстаў сталі многія сотні мірных жыхароў Еўропы. Такія жудасныя здарэнні, на жаль, у Старым Свеце зусім не рэдкасць — у той жа Францыі сёлета гэта чацвёрты тэракт. 7 студзеня браты-ісламісты Саід і Шэрыф Кашы, узброеныя аўтаматамі Калашнікава, гранатамётам, некалькімі пісталетамі і помпавым драбавіком, з крыкамі «Алаху Акбар» уварваліся ў рэдакцыю сатырычнага часопіса Charlie Hebdo. У выніку стральбы загінула 12 чалавек і было паранена 11. Праз два дні браты-тэрарысты Кашы былі знішчаны падчас спецаперацыі. Адказнасць за тэракт узялі на сябе баевікі «Аль-Каіды». Ісламісты помсцілі за карыкатуры на прарока Мухамеда, якія публікавала выданне.

9 студзеня ў Парыжы ўзброены Амедзі Кулібалі, саўдзельнік братоў Кашы, напаў на супермаркет кашэрных прадуктаў «Гіпер Кашэр». У выніку тэракта загінула 5 чалавек. 26 чэрвеня непадалёк ад французскага Грэнобля баявік на аўтамабілі пратараніў вароты хімічнага завода Air Products і ўрэзаўся ў балоны з газам. У руках у яго быў сцяг «Ісламскай дзяржавы». Ля ўвахода на прадпрыемства знайшлі абезгалоўленае цела яго дырэктара. Па падазрэнні ў забойстве быў арыштаваны работнік завода Ясін Салі. Раней яго затрымлівалі за радыкалізм, але ў 2008 годзе падазрэнні з яго былі зняты. Па даных французскай паліцыі, Салі падтрымліваў кантакты з тэрарыстамі «Ісламскай дзяржавы».

Францыя і дагэтуль неаднойчы станавілася мішэнню для тэрарыстычных атак. Напрыклад, 11, 15 і 19 сакавіка 2012 года ў гарадах Тулуза і Мантабан на поўдні краіны француз алжырскага паходжання Махамед Мера здзейсніў серыю забойстваў. У гэтыя дні ён двойчы напаў на вайскоўцаў, а таксама на тутэйшую яўрэйскую школу. Мера забіў траіх вайскоўцаў, настаўніка духоўнага выхавання, двух яго дзяцей і 8-гадовую дзяўчынку. Злачынец быў ліквідаваны праз некалькі дзён падчас перастрэлкі з паліцыяй. Адказнасць за злачынства ўзялі на сябе ісламісты, звязаныя з арганізацыяй «Аль-Каіда ў краінах ісламскага Магрыба».

Варта ўзгадаць яшчэ тры буйныя тэракты ў еўрапейскіх краінах, здзейсненыя ў 2000-х. 11 сакавіка 2004 года адбыўся найбуйнейшы тэракт у гісторыі Іспаніі. У Мадрыдзе тэрарысты падарвалі 10 бомбаў у цягніках на некалькіх чыгуначных станцыях. Ад выбухаў загінуў 191 чалавек, былі паранены больш чым 2 тысячы. Адказнасць за злачынствы ўзяла на сябе «Аль-Каіда».

7 ліпеня 2005 года чатыры тэрарысты-смяротнікі падчас гадзін пік здзейснілі выбухі ў грамадскім транспарце Лондана. З прамежкам каля хвіліны былі падарваны тры цягнікі на розных станцыях метро, а праз гадзіну смяротнік падарваў двухпавярховы аўтобус на Тэвісток-сквер. У выніку загінулі 56 чалавек, 700 былі паранены. Адказнасць за тэракт зноў-такі ўзяла на сябе «Аль-Каіда».

22 ліпеня 2011-га ў Нарвегіі адбыўся падвоены тэракт: адзін ва ўрадавым квартале Осла, другі праз паўтары гадзіны — на востраве Утоя. У нарвежскай сталіцы выбухнула бомба з радыёкіраваннем вагой каля 500 кілаграмаў, закладзеная ў аўтамабіль. Ад выбуху на месцы загінулі сем чалавек, яшчэ адзін памёр у бальніцы, раненні атрымалі больш за 200 чалавек. Пасля гэтага выбуху нарвежскі нацыяналіст Андрэс Брэйвік, пераапрануты ў форму паліцэйскага, расстраляў 67 маладых людзей, якія прымалі ўдзел у летнім лагеры Працоўнай партыі. Пасля ён прызнаўся і ў арганізацыі тэракта ў Осла.

Як бачым, еўрапейская геаграфія тэрарызму ахоплівае літаральна ўвесь Стары Свет. На кантыненце не засталося «пастаральных куткоў», якія тэарэтычна не маглі б у імгненне вока ператварыцца ў крывавае пекла...



### ЦІХАЯ ПАНІКА

«На вачах у нас разгортваюцца беспрэцэдэнтныя тэрарыстычныя атакі. Гэта жах. Тэрарысты хочуць, каб мы баяліся. Страх сапраўды ёсць, але ёсць і іншае — нацыя, якая ўмее сябе бараніць», — падкрэсліў у сваім звароце пасля серыі тэрактаў у Парыжы Прэзідэнт Францыі. Франсуа Аланд таксама адзначыў, што прынятае ім рашэнне закрыць межы адпавядае Шэнгенскаму пагадненню і не парушае абавязкаў, узятых краінай у рамках Еўрасаюза.

Надзвычайнае становішча ўводзіцца ў Францыі пяты раз за апошнія 60 гадоў. У 2005 годзе, пасля хваляванняў у парыжскіх прыгарадах, такі рэжым дзейнічаў толькі на тэрыторыі сталічнай акругі. Агульнанацыянальнае надзвычайнае становішча, як цяпер, аб'яўлялася тройчы — у 1955, 1958 і 1961 гадах у сувязі з вайсковым супрацьстаяннем у Алжыры.

Крывавыя падзеі недарма адбыліся напярэдадні кліматычнага саміту, які пачнецца 30 лістапада. У Парыж павінны прыехаць кіраўнікі 80 краін свету, уключаючы ЗША і Расію. Мы ўжо ўзгадвалі пра атаку тэрарыстаў на лонданскае метро. Дарэчы, тады ў брытанскай сталіцы праходзіла сустрэча «Вялікай васьмёркі».

Цікавыя каментарыі з'явіліся ў еўрапейскіх выданнях. Напрыклад, як паведаміла газета Le Figaro, спецслужбы, вайскоўцы, эксперты па бяспецы ўжо неаднаразова папярэджвалі аб небяспецы французскія ўлады. Камітэт па маніторынгу тэрарыстычнай дзейнасці проста заявіў: «Мы маем падставы лічыць, што «Ісламская дзяржава» плануе скарыстаць джыхадзістаў з заходніх краін, каб здзяйсняць тэракты ў іх родных краінах. Іх вяртанне на радзіму — прадуманая тэрарыстычная аперацыя».

The Guardian прыводзіць шакіруючыя лічбы: з трох з лішнім тысяч еўрапейцаў, якія адправіліся на джыхад на Блізкі Усход, мінімум 1430 — французы. Прыкладна столькі ж застаецца ў Францыі, але знаходзяцца падназіраннем спецслужбаў — яны ў той ці іншай форме падтрымліваюць сувязь з ІД і іншымі ісламісцкімі групамі. Усяго колькасць патэнцыйных баевікоў ацэньваецца ў сем тысяч чалавек. Выданне нагадвае, што больш за 150 радыкалаў утрымліваецца цяпер у французскіх турмах. Але найгоршае за ўсё іншае: каля 200 ісламістаў з баявым вопытам вярнуліся ў Францыю, і злавіць іх пакуль не атрымліваецца.

У Германіі сочаць за падзеямі ў Парыжы з не меншай увагай. У краіне, якая стала для мігрантаў з Блізкага Усходу «зямлёй запаветнай», органы бяспекі ўжо не першы месяц знаходзяцца ў стане павышанай гатоўнасці пасля паведамленняў пра тое, што сярод бежанцаў могуць быць тэрарысты. Выданне Die Welt адзначае, што ісламісты вядуць актыўную прапаганду ў інтэрнэце і сацсетках, абяцаючы тэракты ў Еўропе, і, здаецца, іх словы — не пустыя пагрозы.

Германіі пакуль удавалася пазбягаць тэрарыстычных актаў падобнага маштабу. Але, як піша выданне, цягам апошніх месяцаў у спецслужбах і паліцыі «ўладарыць ціхая паніка»: кожны тыдзень прыходзяць новыя папярэджанні пра магчымыя тэракты, паліцыя здымае з самалётаў былых баевікоў, што вярнуліся з Сірыі, а спецназ праводзіць аперацыю за аперацыяй, арыштоўвае тых, хто праскочыў кантроль у аэрапорце. Усяго, па звестках спецслужбаў, на джыхад з'ехалі больш 780 чалавек, многія з іх вярнуліся, атрымаўшы баявы вопыт, і далёка не ўсіх удалося затрымаць. Службы бяспекі налічылі ў Германіі каля 420 радыкальных ісламістаў, яшчэ 320 трапілі ў лік спачувальнікаў. І гэта яшчэ не поўны спіс. Калі ў верасні 2014 года паліцыя ў Касэлі арыштавала наркагандляра, у яго кватэры знайшлі аўтамат Калашнікава, пісталет і вопратку з сімволікай «Ісламскай дзяржавы». Аказалася, злачынец месяц назад вярнуўся з Сірыі і пры гэтым застаўся па-за ўвагай спецслужбаў.




### ПАСЛЯ БОЙНІ

Амерыканская прыватная разведвальна-аналітычная кампанія Stratfor (яе яшчэ называюць «ценявым ЦРУ») у сваім прагнозе расказала пра магчымыя ўнутраныя і знешнепалітычныя наступствы тэрарыстычных атак у Парыжы. «Прыток бежанцаў у Еўропу з такіх краін, як Сірыя, павялічвае верагоднасць пранікнення прадстаўнікоў джыхадзісцкіх груповак у міграцыйны паток дзеля арганізацыі тэрактаў на тэрыторыі Еўропы», — піша Stratfor.

Без сумнення, парыжскія тэракты будуць мець і палітычныя наступствы, як лічаць аналітыкі. Праз пяць дзён адзіны авіяносец Францыі «Шарль дэ Голь» павінен адправіцца ў Персідскі заліў для змагання з «Ісламскай дзяржавай» у Іраку і Сірыі, з канца верасня там таксама здзяйсняе налёты французская баявая авіяцыя.

«З палітычнага пункту погляду, тэракты з'яўляюцца напамінам пра даўнія этнічныя супярэчнасці ў Францыі», — адзначаецца ў матэрыяле Stratfor. У апошнія месяцы ўся ўвага ў гэтым пытанні была сфакусавана на суседняй Германіі — вялікая колькасць мігрантаў прыбывала ў краіну з поўдня і ўсходу, і толькі нешматлікія з іх адпраўляюцца далей, у Францыю. Парыж не прымаў актыўнага ўдзелу і ў вырашэнні міграцыйнага крызісу, хай прадстаўнікі Францыі і былі на сустрэчах, прысвечаных гэтаму пытанню, і ўвогуле падтрымлівалі ідэю Германіі пра размеркаванне ўцекачоў па ўсёй Еўропе. Можна чакаць, што падзеі ў французскай сталіцы ўзмоцняць пазіцыі тых, хто заклікаў да спынення прытоку мігрантаў і закрыцця межаў у такіх краінах, як Германія і Швецыя, а таксама ў большай частцы Цэнтральнай і Усходняй Еўропы.

Бойня ў Парыжы ў чарговы раз паставіла перад усімі пытанне наконт таго, куды рухаецца свет. «Галоўная праблема ў тым, ці ўдасца Захаду (ЗША плюс Еўропа), Расіі, а таксама Кітаю з Індыяй стварыць палітычную і вайсковую кааліцыю і задушыць заразу ў зародку, стварыўшы на будучыню сістэмы кантролю (імунітэту), якія прадухіляюць масавыя захворванні сістэмным тэрарызмам», — заўважае доктар палітычных навук, навуковы супрацоўнік каледжа Сент-Энтані Оксфардскага ўніверсітэта Уладзімір Пастухоў .

І апошняе. Выхад у свет новай кнігі французскага пісьменніка Мішэля Уэльбека «Пакорлівасць» супаў па часе з расстрэлам ісламскімі тэрарыстамі рэдакцыі сатырычнага тыднёвіка Charlie Hebdo. Публікацыя кнігі на рускай мове — з серыяй тэрактаў у Парыжы. У «Пакорлівасці» гаворка ідзе пра недалёкую будучыню. На дварэ пачатак 2020-х, Прэзідэнтам Францыі стаў ісламіст. Кабетам забаронена паказваць ногі і займацца чымсьці, апроч сям'і. Еўрапейскія мужчыны спешна робяцца мусульманамі, каб мець магчымасць захаваць працоўнае месца (галоўны герой — выкладчык Сарбоны), і заводзяць некалькі жонак. Як казаў некалі Уінстан Чэрчыль, no comment...

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.** *litvinov@zviazda.by*